УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Філалагічны факультэт

Кафедра беларускай літаратуры і культуры

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
беларускай літаратуры і культуры
_______________І.М. Гоўзіч
«10» 06 2016 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан
філалагічнага факультэта
___________В.Д. Старычонак
«10» 06 2016 г.

Рэгістрацыйны № УД – 31-2/802/2016

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС

для спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура

Складальнікі
І.М. Гоўзіч, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Заяц Н.В., дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета БДПУ 24 06 2016 г. пратакол № 10

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс “Сучасны літаратурны працэс” складзены з улікам сучаснай канцэпцыі літаратурнай адукацыі. У ВМК вылучаны раздзелы “Сучасны літаратурны працэс краін замежжа” і “Сучасны літаратурны працэс на Беларусі”, што абумоўлена паглыбленым вывучэннем асноўных тэндэнцый развіцця сусветнай літаратуры мяжы ХХ – ХХI ст. (80-я гг. ХХ ст. – ХХI ст.) і іх уплывамі на сучаснае літаратурнае жыццё Беларусі. Курс аб'ядноўвае вялікі рознабаковы матэрыял, які тлумачыцца складанасцю і несістэматызаванасцю культурна-гістарычнай сітуацыі, метадалагічнай перабудовай сучаснага літаратуразнаўства. На сучасным этапе працягваецца пераасэнсаванне мастацкіх з’яў, выпрацоўваюцца новыя крытэрыі ацэнкі.

Вучэбна-метадыны комплекс “Сучасны літаратурны працэс” дае ўяўленне пра складанасць, шматфарбнасць, рознастылёвасць сучаснага літаратурнага працэсу, калі актыўна ідзе працэс станаўлення форм і жанраў літаратуры найноўшага часу. Літаратурнае жыццё канца ХХ – пач. ХХI ст. характарызуецца незакончанасцю працэсаў, пошукамі новых шляхоў спасціжэння рэчаіснасці.

*Мэты вучэбна-метадычнага комплексу* – пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі тэндэнцыямі развіцця сучаснай сусветнай літаратуры; даць уяўленне пра агульныя напрамкі развіцця, эвалюцыю метадаў, стыляў, жанравых форм; пазнаёміць з жыццём і творчасцю сучасных пісьменнікаў, зместам іх твораў і роллю ў літаратурным працэсе.

*Задачы*:

- дацьстудэнтам рознабаковыя веды па прадмеце;
- навучыць арыентавацца ў сучаснай літаратурнай сітуацыі;
- выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры.

Вучэбна-метадычны комплекс складаецца з аглядавых і манаграфічных тэм. У аглядавых даецца агульная характарыстыка пэўнага перыяду, вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі ў творчасці пісьменнікаў, раскрываецца ўплыў грамадска-палітычных падзей на літаратуру. Манаграфічна прапануецца вывучаць творчасць мастакоў слова, што заявілі пра сябе як яркія індывідуальнасці і вызначаюць мастацкі ўзровень сённяшней літаратуры.

Вучэбна-метадычны комплекс складзены з улікам зместу праграм па “Гісторыі беларускай літаратуры”, “Тэорыі літаратуры”, “Уводзінаў у літаратуразнаўства”.

ВМК мае наступную структуру: тэарэтычны і практычны раздзелы, раздзел кантролю ведаў, дапаможны раздзел.

Тэарэтычны раздзел утрымлівае лекцыйныя матэрыялы па дысцыпліне, змест якіх адпавядае тыпавой і вучэбным праграмам. У практычным раздзеле змешчаны метадычныя рэкамендацыі для правядзення практычных заняткаў, дзе пазначана мэта вывучэння дысцыпліны, указаны рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Раздзел кантролю ведаў утрымлівае матэрыялы, якія дазваляюць вызначыць адпаведнасць вынікаў вучэбнай дзейнасці адукацыйным стандартам: тут змешчаны крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, пералічаны сродкі дыягностыкі кампетэнцый студэнтаў, дадзены пытанні да экзаменаў і залікаў па дысцыпліне. Дапаможны раздзел уключае ў сябе вучэбна-праграмную дакументацыю, падрабязны спіс літаратуры.

Для работы з ВМК па дысцыпліне “Сучасны літаратурны працэс” рэкамендуюцца наступныя метады і прыёмы навучання:

– вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу,
– дыспут,
– эмпірычная гутарка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# I. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ТЭАРЭТЫЧНАГА ВЫВУЧЭННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**I семестр (14 лк.+2 КСР; 12 пр.+2 КСР)**

**1 кантрольная работа**

**Лекцыйныя заняткі**

***1. Сэнсавыя дамінанты сучаснай культуры і літаратуры. Постмадэрнізм.***

***2. Сэнсавыя дамінанты сучаснай культуры і літаратуры. Постмадэрнізм КСР.***

Заданні:

1 узровень – падрыхтаваць рэферат па тэме «Месца і роля мастацкай літаратуры ў сучасным свеце»;

2 узровень – падрыхтаваць літаратуразнаўчы слоўнік па тэме «Жанры масавай літаратуры»;

3 узровень – напісаць эсэ на тэму «Літаратура XXII стагоддзя: ці будзе яна?» або «10 прычын любіць і не любіць сучасную культуру».

***3. Сучасная літаратура еўрапейскіх краін.***

***4. Сучасная літаратура еўрапейскіх краін.***

***5. Літаратура славянскіх краін.***

***6. Літаратура краін амерыканскага кантыненту.***

***7. Літаратура краін амерыканскага кантыненту.***

***8. Літаратура краін Усходу і Азіі.***

**II семестр (36 лк.+2 КСР; 30 пр.+2 КСР)**

**3 кантрольныя работы**

**Лекцыйныя заняткі**

***1. Сацыякультурная сітуацыя 1990-х–2010-х гадоў***

***2. Сацыякультурная сітуацыя 1990-х–2010-х гадоў***

***3. Сацыякультурная сітуацыя 1990-х–2010-х гадоў***

***4. Сацыякультурная сітуацыя 1990-х–2010-х гадоў КСР.***

Заданні:

1 узровень – падрыхтаваць рэферат па тэме «Асаблівасці сучаснага літаратурнага працэсу на Беларусі»;

2 узровень – падрыхтаваць мультымедыйную прэзентацыю, прысвечаную жыццёваму і творчаму шляху любімага беларускага пісьменніка;

3 узровень – напісаць даклад на тэму (па варыянтах):

1. «Роля і месца пакалення Таварыства вольных літаратараў у гісторыі беларускай літаратуры»;
2. «Пакаленне Тутэйшыя ў гісторыі беларускай літаратуры: прадстаўнікі і творы»;
3. «Эксперымент і творчы пошук у сяброў Бум-Бам-Літа».

***5. Жанрава-тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# II. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## *Тэматыка практычных заняткаў*

**I семестр (14 лк.+2 КСР; 12 пр.+2 КСР)**

**1 кантрольная работа**

**Практычныя заняткі**

***1. Сучасная літаратура еўрапейскіх краін.***

1. Асаблівасці сучаснай французскай літаратуры.

2. Літаратура Велікабрытаніі: асаблівасці развіцця на мяжы стагоддзяў.

***2. Сучасная літаратура еўрапейскіх краін.***

1. Літаратура сучаснай Германіі: постмадэрнісцкія стратэгіі тэксту.

2. Сучасная літаратура Італіі, Іспаніі і Партугаліі: аднаўленне прынцыпаў пісьма, традыцыі ў псіхалагічнай прозе.

***3. Літаратура славянскіх краін.***

1. Росквіт рамана, размыканне яго жанравых межаў, змяненне апавядальных структур, пранікненне фальклорнай і міфалагічнай вобразнасці ў мастацкія творы.

2. Масавая літаратура. Навуковая фантастыка і фэнтэзі.

3. Літаратура на мяжы XX–XXI стагоддзяў.

4. Творы Януша Вішнеўскага, Імрэ Кертэса, Віславы Шымборскай, С. Лема і інш.

***4. Літаратура краін амерыканскага кантыненту.***

1. Спалучэнне традыцый навуковай фантастыкі і выпрацоўка жанру рамана-антыўтопіі (Рэй Брэдберы, Курт Ванегут). Раманы-жахі С. Кінга.

2. Амерыканская літаратура на мяжы XX–XXI стст. Творы Дэніэла Кіза, Чака Паланіка, Дэна Сіманса, Тоні Морысана, Джэрома Сэлінджэра, Харпер Лі, Джэка Керуака і інш.

3. Жанр комікcу ў амерыканскай літаратуры.

***5. Літаратура краін амерыканскага кантыненту.***

1. Спецыфіка лацінаамерыканскай прозы ў XXI стагоддзі.

2. Проза Габрыэля Гарсія Маркеса, Жоржа Амаду, Хасэ Картасара, Хасэ Луіса Борхеса, Паула Каэлья, Лауры Эсківель і інш.Заданні:

***6. Літаратура краін амерыканскага кантыненту КСР.***

Заданні:

1 узровень – падрыхтаваць рэферат па тэме «Жанры фэнтэзі і антыўтопіі ў сучаснай амерыканскай літаратуры» або «Стывен Кінг – майстар трылеру»;

2 узровень – падрыхтаваць мультымедыйную прэзентацыю па тэме «Комікс у літаратуры ЗША» або «Сучасная лацінаамерыканская літаратура»;

3 узровень – напісаць даклад на тэму (на выбар студэнта):

1. «Творчы партрэт Дэніэла Кіза»;

2. «Творчы партрэт Чака Паланіка»;

3. «Творчы партрэт Джэрома Сэлінджэра»;

4. «Творчы партрэт Харпер Лі»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. «Творчы партрэт Габрыэля Гарсія Маркеса»;
6. «Творчы партрэт Хасэ Луіса Борхеса»;
7. «Творчы партрэт Паула Каэлья».

***7. Літаратура краін Усходу і Азіі .***

1. Асаблівасці літаратуры Усходу і Азіі на сучасным этапе: тэматычная, жанравая і стылёвая разнастайнасць.
2. Ясунары Кавабата, Коба Абэ, Кэндзабура Оэ, Харукі Муракамі, Мо Янь, Гаа Сінцзянь, Архан Памук, Дорыс Лесінг і інш.

**“Сучасны літаратурны працэс”**
**II семестр (36 лк.+2 КСР; 30 пр.+2 КСР)**
**3 кантрольныя работы**

***1. Сацыякультурная сітуацыя 1990-х–2010-х гадоў.***

1. Выхад беларускай літаратуры за межы нацыянальнай традыцыі, падключэнне да эстэтычных сістэм еўрапейскага і сусветнага мастацтва.
2. Адначасовая праца ў літаратуры 1990-х – 2010-х гадоў прадстаўнікоў розных пакаленняў.
3. Адметнасць розных эстэтыка-выяўленчых кірункаў, плыняў, тэндэнцый у сучаснай літаратуры.
4. Сувязь сучаснага літаратурнага працэсу з філасофіяй экзістэнцыялізму, пазітывізму, постмадэрнізму і інш.
5. Літаратурныя суполкі. Роля Саюза пісьменнікаў Беларусі ў актывізацыі літаратурнага жыцця. Беларускі літаратурны перыядычны друк.
6. Сітуацыя полілінгвізму ў літаратуры Беларусі.

***2. Жанрава-тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі.***

1. Паварот да публіцыстычнай адкрытасці, прысутнасць адраджэнскай тэматыкі, зварот да постацей знакамітых продкаў.
2. Адлюстраванне трагедыйных перыпетый ХХ стагоддзя ў сучаснай паэзіі.
3. Пейзажная лірыка, вострае экалагічнае гучанне вершаў пра прыроду.
4. Лірыка кахання.

***3. Жанрава-тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі.***

1. Інтэлектуальна-філасофская плынь у паэзіі.
2. Біблейска-філасофскія і экзістэнцыяльныя матывы ў сучаснай паэзіі.
3. Жанрава-стылёвыя пошукі ў сучаснай беларускай літаратуры: аўтарскія жанры і жанравыя формы.

***4. Сучасны паэтычны эпас: дынаміка развіцця.***

1. Беларуская паэма на сучасным этапе. Разнастайнасць мастацкіх форм, жанравыя кантамінацыі, праблемна-тэматычная сінтэзнасць.
2. Чарнобыльская трагедыя і асэнсаванне драматычных перыпетый ХХ стагоддзя ў паэмах Я. Сіпакова, Р. Барадуліна, С. Законнікава, М. Башлакова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Драматызацыя паэмнага жанру: творы А. Лойкі, Р. Баравіковай, Л. Рублеўскай, У. Скарынкіна, інш.

4. Сучасная інтэлектуальная паэма.

***5. Сучасны паэтычны эпас: дынаміка развіцця КСР.***

Заданні:

1 узровень – падрыхтаваць рэферат па тэме «Жанрава-тэматычная разнастайнасць беларускай сучаснай паэмы» або «Гістарычная тэма ў беларускіх паэмах»;

2. узровень – напісаць даклад на тэму (на выбар студэнта):

1. «Драматычныя паэмы Раісы Баравіковай на сцэнах тэатраў»;

2. «Мастацка-вобразны свет паэм Янкі Сіпакова»;

3. «Рыгор Барадулін – майстар паэмнага жанру».

3 узровень – падрыхтаваць анталогію «Беларуская паэма на сучасным этапе» (з урыўкаў твораў, ілюстрацыямі і анатацыямі да іх).

**6.** ***Тэматычнае багацце беларускай прозы.***

1. Сучасная літаратура і інтэрнэт як новы спосаб літаратурнага мыслення і ўзаемаадносін з чытачом. Сецаратура, фанфікшн. Літаратурныя блогі ў інтэрнэце.

2. Сучасныя літаратурныя прэміі.

3. Тэма гістарычнага і ваеннага мінулага ў беларускай прозе. Жанравыя формы, стылёвая разнастайнасць, абыходжанне з гістарычнай фактурай.

**7.** ***Тэматычнае багацце беларускай прозы.***

1. Карціны вясковага жыцця ў творах А. Федарэнкі, А. Казлова, А. Жука, В. Казько, У. Гніламёдава, Г. Марчука, Х. Лялько і інш.

2. Экалагічная тэматыка. Чалавек і прырода, страчанае іх адзінства як асноўная праблема творчасці сучасных аўтараў.

3. Адлюстраванне ўрбанізаванага жыцця і побыту ў празаічных творах.

4. Сучасная «спавядальная» проза. Суб'ектывізацыя і лірызацыя аўтабіяграфічнай плыні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**8.** ***Беларуская проза XXI стагоддзя: жанрава-стылёвыя пошукі.***

1. Новыя з'явы ў творчасці пісьменнікаў старэйшага пакалення (фантастыка, містыка, экзістэнцыяльныя матывы, фантасмагорыя, алюзіі, фрагментарнасць, інтэртэкстуальнасць).

2. Авангардныя пошукі маладых празаікаў, постмадэрнісцкая паэтыка.

3. Сучасная «жаночая» проза.

**9.** ***Беларуская проза XXI стагоддзя: жанрава-стылёвыя пошукі.***

1. Дэтэктыўны жанр у беларускай літаратуры.

2. Беларуская літаратурная казка, фэнтэзі і фантастыка, містыка, комікс, нон-фікшн, «зацемкі» і інш.

***10. Тэматычная разнастайнасць беларускай драматургіі.***

1. Агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай драматургіі.

2. Узмацненне ўвагі да набыткаў сусветнага драматургічнага і тэатральнага мастацтва.

3. Традыцыі нацыянальнай і сусветнай драматургіі ў п’есах з гістарычнай тэматыкай.

***11. Тэматычная разнастайнасць беларускай драматургіі.***

1. Інтэрпрэтацыя рэальных гістарычных падзей і асоб у драмах.

2. Надзённыя канфлікты жыцця, спецыфіка іх вырашэння ў творах сучасных драматургаў.

***12. Жанравае багацце сучаснай беларускай драматургіі.***

1. Новыя жанравыя формы ў сучаснай беларускай драматургіі:
п’еса-прытча,
п’еса-фантасмагорыя,
п’еса-містыфікацыя,
п’еса-казка для дарослых і інш.

***13. Жанравае багацце сучаснай беларускай драматургіі.***

1. Тэатр абсурду: трансфармацыя рэальнасці, спалучэнне несумяшчальнага, алагічныя паводзіны герояў у п'есах.

2. Перапрацоўка вядомых сюжэтаў, матываў, вобразаў у рымэйках.

***14. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі.***

1. Узровень даследавання рускамоўнай літаратуры Беларусі. Роля і месца яе ў літаратурным працэсе.

2. Проза:
А. Андрэева,
Э. Скобелева,
А. Паповай,
М. Ляшук,
Я. Таганава,
М. Чаргінца,
Н. Батраковай,
Я. Пастэрнак і А. Жвалеўскага і інш.

***15. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі.***

1. Рускамоўная паэзія: жанрава-стылявая разнастайнасць:
В. Блажэнны,
К. Міхеева,
С. Бень,
В. Паліканіна,
А. Скарынкін,
В. Бурлак і інш.

***16. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі.***

1. Рускамоўная драматургія на мяжы XX–XXI стст.:
А. Папова,
А. Дзялендзік,
А. Курэйчык,
К. Сцешык,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Пражко,
М. Халезін і інш.

## Спіс твораў для чытання па дысцыпліне “Сучасны літаратурны працэс” I семестр

1. Умберта Эка «Імя ружы» і **каментарыі** да твора.
2. Мішэль Уэльбек «Возможность острова» ці «Элементарные частицы».
3. Фрэдэрык Бегбедэр «Любовь живет три года».
4. Стывен Фрай «Лжец» ці «Как творить историю».
5. Кадзуа Ісігура «Не отпускай меня».
6. Патрык Зюскінд «Парфюмер».
7. Бернхард Шлінк «Чтец».
8. Федэрыка Мочыа «Три метра над небом».
9. Януш Вішнеўскі «Одиночество в сети».
10. Курт Ванегут «Бойня № 5» ці «Механическое пианино».
11. Стывен Кінг (1 твор на выбар).
12. Дэніэл Кіз «Цветы для Элджернона»
13. Чак Паланік «Бойцовский клуб».
14. Джэром Сэлінджэр «Над пропастью во ржи».
15. Харпер Лі «Убить пересмешника».
16. Габрыэль Гарсія Маркес (1 твор на выбар).
17. Паула Каэлья (1 твор на выбар).
18. Лаура Эсківель (1 твор на выбар).
19. Харукі Муракамі (1 твор на выбар).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Спіс твораў для чытання па дысцыпліне “Сучасны літаратурны працэс” II семестр

Г. Кісліцына «Новая літаратурная сітуацыя».

### Паэзія 1990–2010-х гг.

вершы П. Панчанкі, М. Танка, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, В. Зуёнка, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна;

вершы **А. Разанава**, В. Шніпа, Р. Баравіковай, Г. Пашкова, Л. Галубовіча, М. Мятліцкага, М. Башлакова, Л. Дранько-Майсюка (на выбар 3 пісьменнікі);

вершы А. Хадановіча, В. Жыбуля, В. Бурлак, Т. Сівец, К. Масэ, М. Найдзёнава і інш. (на выбар 3 пісьменнікі).

Паэмы Я. Сіпакова, Р. Барадуліна, С. Законнікава, А. Лойкі, А. Разанава, М. Башлакова. Р. Баравіковай, Л. Рублеўскай, У. Скарынкіна (на выбар 2 паэмы).

***Сучасныя жанравыя формы (скласці слоўнік з прыкладамі).***

## Проза 1990–2010-х гг.

*Тэма гістарычнага і ваеннага мінулага ў беларускай прозе* (У. Арлоў, К. Тарасаў, І. Шамякін, В. Іпатава, Г. Далідовіч, Л. Дайнека, В. Чаропка, А. Наварыч, А. Адамовіч, В. Быкаў, У. Гніламёдаў, Л. Рублеўская і інш.) (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

*Карціны вясковага жыцця і экалогіі* ў творах А. Федарэнкі, А. Казлова, А. Жука, В. Казько, У. Гніламёдава, Г. Марчука, Х. Лялько і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

*Адлюстраванне ўрбанізаванага жыцця і побыту ў празаічных творах* Г. Марчука, А. Глобуса, А. Асташонка, Г. Багданавай, Ю. Станкевіча, А. Бахарэвіча і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

Авангардныя пошукі маладых празаікаў, постмадэрнісцкая паэтыка ў кнігах А. Бахарэвіча, І. Сідарука, А. Глобуса, С. Балахонава, Е. Вежнавец і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

*Сучасная «жаночая» проза*: Л. Рублеўская, А. Брава, В. Куртаніч, Н. Бабіна і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

*Дэтэктыўны жанр у беларускай літаратуры*: творы Г. Марчука, Ю. Станкевіча, Л. Рублеўскай, М. Чаргінца і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

*Беларуская літаратурная казка, фэнтэзі і фантастыка, містыка, комікс, нон-фікшн, «зацемкі»* і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

## Драматургія 1990–2010-х гг.

*Інтэрпрэтацыя рэальных гістарычных падзей і асоб у драмах* А. Дударава, А. Петрашкевіча, У. Бутрамеева і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

*Надзённыя канфлікты жыцця, спецыфіка іх вырашэння ў творах* М. Матукоўскага, Г. Марчука, А. Дударава, А. Паповай і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

*Новыя жанравыя формы ў сучаснай беларускай драматургіі* (п’еса-прытча, п’еса-фантасмагорыя, п’еса-містыфікацыя, п’еса-казка для дарослых, рымейк і інш.): А. Ждана, М. Арахоўскага, А. Курэйчыка, С. Кавалёва, І. Сідарука, інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

## Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі

Проза А. Андрэева, Э. Скобелева, А. Паповай, М. Ляшук, Я. Таганава, М. Чаргінца, Н. Батраковай, Я. Пастэрнак і А. Жвалеўскага і інш. (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

Паэзія: жанрава-стылявая разнастайнасць (В. Блажэнны, К. Міхеева, С. Бень, В. Паліканіна, А. Скарынкін, В. Бурлак і інш.) (вершы 2 розных пісьменнікаў на выбар)

Драматургія на мяжы XX–XXI стст. (А. Папова, А. Дзялендзік, А. Курэйчык, К. Сцешык, П. Пражко, М. Халезін і інш.) (2 творы розных пісьменнікаў на выбар).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# III. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## Прыкладны пералік заданняў кіруемай самастойнай работы студэнтаў

***Тэма 1.1. «Сэнсавыя дамінанты сучаснай культуры і літаратуры. Постмадэрнізм»*** – 2 гадзіны лекцыйных заняткаў.

Заданні:

1 узровень – падрыхтаваць рэферат па тэме «Месца і роля мастацкай літаратуры ў сучасным свеце»;

2 узровень – падрыхтаваць літаратуразнаўчы слоўнік па тэме «Жанры масавай літаратуры»;

3 узровень – напісаць эсэ на тэму «Літаратура XXII стагоддзя: ці будзе яна?» або «10 прычын любіць і не любіць сучасную культуру».

***Тэма 1.4. «Літаратура краін амерыканскага кантыненту»*** – 2 гадзіны практычных заняткаў.

Заданні:

1 узровень – падрыхтаваць рэферат па тэме «Жанры фэнтэзі і антыўтопіі ў сучаснай амерыканскай літаратуры» або «Стывен Кінг – майстар трылеру»;

2 узровень – падрыхтаваць мультымедыйную прэзентацыю па тэме «Комікс у літаратуры ЗША» або «Сучасная лацінаамерыканская літаратура»;

3 узровень – напісаць даклад на тэму (на выбар студэнта):

1. «Творчы партрэт Дэніэла Кіза»;
2. «Творчы партрэт Чака Паланіка»;
3. «Творчы партрэт Джэрома Сэлінджэра»;
4. «Творчы партрэт Харпер Лі»;
5. «Творчы партрэт Габрыэля Гарсія Маркеса»;
6. «Творчы партрэт Хасэ Луіса Борхеса»;
7. «Творчы партрэт Паула Каэлья».

***Тэма 2.1. «Сацыякультурная сітуацыя 1990-х–2010-х гадоў»*** – 2 гадзіны лекцыйных заняткаў.

Заданні:

1 узровень – падрыхтаваць рэферат па тэме «Асаблівасці сучаснага літаратурнага працэсу на Беларусі»;

2 узровень – падрыхтаваць мультымедыйную прэзентацыю, прысвечаную жыццёваму і творчаму шляху любімага беларускага пісьменніка;

3 узровень – напісаць даклад на тэму (па варыянтах):

1. «Роля і месца пакалення Таварыства вольных літаратараў у гісторыі беларускай літаратуры»;
2. «Пакаленне Тутэйшыя ў гісторыі беларускай літаратуры: прадстаўнікі і творы»;
3. «Эксперымент і творчы пошук у сяброў Бум-Бам-Літа».

***Тэма 2.2.2. «Сучасны паэтычны эпас: дынаміка развіцця»*** – 2 гадзіны практычных заняткаў.

Заданні:

1 узровень – падрыхтаваць рэферат па тэме «Жанрава-тэматычная разнастайнасць беларускай сучаснай паэмы» або «Гістарычная тэма ў беларускіх паэмах»;

2. узровень – напісаць даклад на тэму (на выбар студэнта):

1. «Драматычныя паэмы Раісы Баравіковай на сцэнах тэатраў»;
2. «Мастацка-вобразны свет паэм Янкі Сіпакова»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. «Рыгор Барадулін – майстар паэмнага жанру».

3 узровень – падрыхтаваць анталогію «Беларуская паэма на сучасным этапе» (з урыўкаў твораў, ілюстрацыямі і анатацыямі да іх).

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі кампетэнцый студэнта

У якасці сродкаў дыягностыкі выніковасці навучання па вучэбнай дысцыпліне «Сучасны літаратурны працэс» прапануюцца:

– пытанні, змест якіх актуалізуе назапашаны раней вопыт;
– пытанні, змест якіх дазваляе выявіць базавыя веды студэнтаў;
– пытанні, змест якіх дазваляе вызначыць ступень сфарміраванасці тэарэтычных і эмпірычных ведаў па вучэбнай дысцыпліне;
– практычныя заданні;
– тэставыя заданні, якія дазваляюць ажыццяўляць бягучы кантроль;
– рэфераты па асобных тэмах практычных заняткаў;
– тэмы для самастойнай работы студэнтаў;
– пытанні і заданні да заліку;
– пытанні і заданні да экзамену.

Рэкамендаваныя формы бягучага кантролю – залік і экзамен.

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

*10 (дзесяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*9 (дзевяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*8 (восем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*7 (сем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*6 (шэсць) балаў, залічана:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*5 (пяць) балаў, залічана:*

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

*4 (чатыры) балы, залічана:*

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

*3 (тры) балы, незалічана:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*2 (два) балы, незалічана:*

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*1 (адзін) бал, незалічана:*

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

**Пералік тэарэтычных пытанняў да заліку**
**па вучэбнай дысцыпліне "Сучасны літаратурны працэс"**

1. «Цэнтр і перыферыя» ў культуры: маргінальнасць як фактар развіцця літаратуры.
2. Месца і роля мастацкай літаратуры ў сучасным свеце.
3. Масавая культура. Паэтыка масавай літаратуры: арганізацыя сюжэта, тыпу героя.
4. Жанры масавай літаратуры. Белетрыстыка.
5. «Сітуацыя постмадэрну»: тэарэтычныя аспекты вывучэння сучаснай літаратуры.
6. Агульная характарыстыка развіцця літаратуры еўрапейскіх краін канца XX – пачатку XXI стагоддзяў.
7. Асаблівасці сучаснай французскай літаратуры: асноўныя прадстаўнікі і тэмы: Рамэна Гары, Хорхе Семпруна, Патрыка Мадзіана, Мішэля Уэльбека, Жана-Філіпа Тусэна, Фрэдэрыка Бегбедэра, Амелі Натомб, Мартэна Пажа, Жана-Крыстофа Гранжэ, Жан-Мары Гюстава Леклезія (на выбар).
8. Літаратура Велікабрытаніі: асаблівасці развіцця на мяжы стагоддзяў. Творы Джона Фаўлза, Стывена Фрая, Джуліана Барнса, Джона Бойна, Джонатана Коў, Кадзуа Ісігура, Гарольда Пінтэра, Шэймуса Хіні і інш. (на выбар).
9. Літаратура сучаснай Германіі: постмадэрнісцкія стратэгіі тэксту. Патрык Зюскінд, Юдзіт Куккарт, Грэта Мюлер, Арнольд Штадлер, Бернхард Шлінк, Вільгельм Генацына, Хельмут Краўсэр, Юлі Цэе, Гюнтэр Грас і інш. (на выбар).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Славянская літаратура на мяжы XX–XXI стагоддзяў. Творы Януша Вішнеўскага, Імрэ Кертэса, Віславы Шымборскай, Герты Мюлер і інш. (на выбар).

11. Спалучэнне традыцый навуковай фантастыкі і выпрацоўка жанру рамана-антыўтопіі ў амерыканскай літаратуры (Рэй Брэдберы, Курт Ванегут).

12. Раманы-жахі Стывена Кінга.

13. Творы Дэніэла Кіза, Чака Паланіка, Дэна Сіманса, Тоні Морысана, Джэрома Сэлінджэра, Харпер Лі, Джэка Керуака і інш. (на выбар).

14. Жанр коміксу ў амерыканскай літаратуры.

15. Спецыфіка лацінаамерыканскай прозы ў XXI стагоддзі.

16. Спалучэнне рэальнага і міфалагічнага, фантастыкі і гратэску ў межах магічнага рэалізму ў лацінаамерыканскай літаратуры: Габрыэль Гарсія Маркес, Жорж Амаду, Хасэ Картасар, Хасэ Луіс Борхес, Паула Каэлья, Лаура Эсківель і інш. (на выбар).

17. Асаблівасці літаратуры Усходу і Азіі на сучасным этапе: тэматычная, жанрава-стылёвая разнастайнасць. Ясунары Кавабата, Коба Абэ, Кэндзабура Оэ, Харукі Муракамі, Мо Янь, Гаа Сінцзянь, Архан Памук, Дорыс Лесінг і інш. (на выбар).

**Пералік тэарэтычных пытанняў да экзамену па вучэбнай дысцыпліне “Сучасны літаратурны працэс”**

1. Месца і роля мастацкай літаратуры ў сучасным свеце. Літаратура XXI ст.: стан і перспектывы развіцця.

2. “Цэнтр і перыферыя” ў культуры: маргінальнасць як фактар развіцця літаратуры XX ст. Пераасэнсаванне асобы аўтара ў літаратурным працэсе.

3. Постмадэрнізм як комплекс філасофскіх, навукова-тэарэтычных і эстэтычных з’яў. Асаблівасці постмадэрнісцкага тэксту.

4. Сацыякультурная сітуацыя на Беларусі ў 1990–2010-х гг.

5. Нацыянальныя літаратурныя суполкі 1980–1990-х гг.: “Тутэйшыя”, “Таварыства вольных літаратараў”, “Бум-Бам-Літ”.

6. Тэма ваеннага мінулага ў беларускай прозе (А. Адамовіч, В. Быкаў, І. Шамякін і інш.).

7. Тэма гістарычнага мінулага ў беларускай прозе (Г. Далідовіч, Л. Дайнека, В. Чаропка, А. Наварыч, У. Арлоў, К. Тарасаў, І. Шамякін, В. Іпатава і інш.).

8. Карціны вясковага жыцця ў творах А. Федарэнкі, А. Жука, В. Казько У. Гніламёдава, Г. Марчука, Х. Лялько (на выбар).

9. Экалагічная тэматыка твораў А. Жука, І. Пташнікава, І. Шамякіна, А. Федарэнкі і інш.

10. Чалавек і прырода, страчанае іх адзінства як асноўная праблема творчасці В. Казько (“Выратуй і памілуй нас, чорны бусел”).

11. Адлюстраванне урбанізаванага жыцця і побыту ў празаічных творах А. Асташонка, А. Казлова, Г. Багданавай, Ю. Станкевіча.

12. Тэма горада, вобраз інтэлігента-гараджаніна ў першым пакаленні ў творах А. Глобуса, А. Асташонка і інш.

13. Дэтэктыўны жанр у сучаснай беларускай літаратуры (на прыкладзе твораў Г. Марчука, М. Чаргінца, Л. Рублеўскай, Т. Сабоцкай, М. Адамчыка, М. Клімковіча).

14. Сучасная “жаночая” проза (аналіз твораў А. Брава, В. Куртаніч, Н. Бабінай ці інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

15. Тэматычнае багацце сучаснай беларускай паэзіі (на прыкладзе твораў 2 – 3 аўтараў).

16. Умоўныя і фантастычныя сітуацыі, вобразы, літаратурныя рэмінісцэнцыі і алюзіі ў творах А. Федарэнкі “Рэвізія”, “Смута, альбо 12 фантазій на адну тэму” і інш.

17. Жанравая разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі. Нетрадыцыйныя аўтарскія жанры і жанравыя формы.

18. Публіцыстычны пачатак і способы яго выяўлення ў вершах П. Панчанкі, М. Танка, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага і інш.

19. Адлюстраванне трагедыйных перыпетый ХХ ст. у сучаснай паэзіі (П. Панчанка, С. Грахоўскі і інш.).

20. Гістарычная тэма ў сучаснай беларускай паэзіі (М. Танк, В. Шніп, Р. Баравікова, А. Пісьмянкоў і інш.).

21. Сучасная пейзажная лірыка, вострае экалагічнае гучанне вершаў пра прыроду (М. Танк, С. Законнікаў, М. Башлакоў, М. Мятліцкі і інш.).

22. Беларуская міфалогія ў творах М. Танка, Р. Барадуліна, А. Мінкіна, А. Сыса і інш.

23. Інтэлектуальна-філасофская плынь у паэзіі: М. Танк, С. Дзяргай, А. Русецкі, У. Караткевіч, А. Вярцінскі, П. Макаль, А. Разанаў, Г. Булыка і інш.

24. Лірыка кахання Г. Бураўкіна, Р. Баравіковай, Л. Дранько-Майсюка, І. Багдановіч і інш.: адметнасці лірычнага героя.

25. Біблейска-філасофскія і экзістэнцыяльныя матывы ў сучаснай беларускай паэзіі.

26. Беларуская паэма на сучасным этапе. Разнастайнасць мастацкіх форм, жанравыя кантамінацыі, праблемна-тэматычная сінтэзнасць.

27. Асэнсаванне наступстваў чарнобыльскай трагедыі ў паэме Я. Сіпакова “Одзіум”. Паэмы ў прозе Я. Сіпакова “Хата”, “Ахвярны двор”, “Услед за травою”, “З чужымі багамі” (1 на выбар).

28. Драматызацыя паэмнага жанру: творы А. Лойкі, Р. Баравіковай, Л. Рублеўскай, У. Скарынкіна і інш.

29. Агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай драматургіі.

30. Новыя жанравыя формы ў сучаснай беларускай драматургіі (п’еса-прытча, п’еса-фантасмагорыя, п’еса-містыфікацыя, п’еса-казка для дарослых і інш.).

31. Інтэрпрэтацыя рэальных гістарычных падзей і асоб у драмах А. Дударава (“Князь Вітаўт”, “Палачанка”, “Чорная панна Нясвіжа”, “Усяслаў Чарадзей”, “Крыж”).

32. Інтэрпрэтацыя рэальных гістарычных падзей і асоб у драмах А. Петрашкевіча (“Прарок для Айчыны”, “Наканавана быць прарокам”) і У. Бутрамеева (“Страсці па Аўдзею”).

33. Надзённыя канфлікты жыцця, спецыфіка іх вырашэння ў творах А. Дударава (“Парог”), А. Федарэнкі (“Багаты кватарант”), М. Матукоўскага (“Бездань”, “Калізей”) і Г. Марчука (“Блудны сын і Варвара”, “Люцікі-кветачкі”) (2–3 на выбар).

34. Трансфармацыя рэальнасці, спалучэнне несумяшчальнага, алагічныя паводзіны герояў у п'есах М. Арахоўскага (“Ку-ку”, “Лабірынт”), І. Сідарука (“Галава”) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

35. Перапрацоўка вядомых сюжэтаў, матываў, вобразаў у п'есах С. Кавалёва (“Звар'яцелы Альберт”, “Стомлены д'ябал”, “Францішка, або Навука кахання”) і інш.

36. Тэматычная і жанравая разнастайнасць рускамоўнай прозы А. Андрэева, Э. Скобелева, А. Паповай, М. Чаргінца і інш.

37. Рускамоўная паэзія: жанрава-стылёвая разнастайнасць (В. Блажэнны, В. Паліканіна, А. Скарынкін, В. Бурлак і інш.).

38. Рускамоўная драматургія на мяжы XX – XXI стст. (А. Папова, А. Дзялендзік, А. Курэйчык, М. Халезін ці інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# IV. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

**Установа адукацыі**
**«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт**
**імя Максіма Танка»**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай
і інфармацыйна-аналітычнай рабоце
____________В.М. Зелянкевіч
«___»________________2016 г.

Рэгістрацыйны № УД-31-2/____ / вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2016 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-02 03 01 № 87 ад 30.08.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
І.М. Гоўзіч, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Н.В. Заяц, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
І.Д. Воюш, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ Інстытута журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
А.У. Гранкіна, дацэнт кафедры рускай і зарубежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 ад 29.03.2016 г.);

Загадчык кафедры
_______________І.М. Гоўзіч

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 5 ад 26.04.2016 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
управлення БДПУ

_____________ ____________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Сучасны літаратурны працэс» складзена з улікам сучаснай канцэпцыі літаратурнай адукацыі і адпавядае патрабаванням да вучэбных праграм новага пакалення. У вучэбнай дысцыпліне вылучаны раздзелы «Сучасны сусветны літаратурны працэс» і «Сучасны літаратурны працэс на Беларусі», што абумоўлена паглыбленым вывучэннем асноўных тэндэнцый развіцця сусветнай літаратуры мяжы XX – XXI ст. (90-я гг. XX ст. – XXI ст.) і іх уплывамі на сучаснае літаратурнае жыццё Беларусі. Вучэбная дысцыпліна аб'ядноўвае вялікі рознабаковы матэрыял, спецыфіка якога вызначаецца складанасцю і несістэматызаванасцю культурна-гістарычнай сітуацыі, метадалагічнай перабудовай сучаснага літаратуразнаўства. На сучасным этапе працягваецца пераасэнсаванне мастацкіх з’яў, выпрацоўваюцца новыя крытэрыі ацэнкі. Праграма дае ўяўленне пра складанасць, шматфарбнасць, рознастылёвасць сучаснага літаратурнага працэсу, калі актыўна ідзе працэс станаўлення форм і жанраў літаратуры найноўшага часу. Літаратурнае жыццё канца XX – пач. XXI ст. характарызуецца незакончанасцю працэсу, пошукамі новых шляхоў спасціжэння рэчаіснасці.

*Мэты вучэбнай дысцыпліны* – пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі тэндэнцыямі развіцця сучаснай сусветнай літаратуры; даць уяўленне пра агульныя напрамкі развіцця, эвалюцыю метадаў, стыляў, жанравых форм; пазнаёміць з жыццём і творчасцю сучасных пісьменнікаў, зместам іх твораў і роляй у літаратурным працэсе.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны*:

- даць студэнтам рознабаковыя веды па прадмеце;
- навучыць арыентавацца ў сучаснай літаратурнай сітуацыі;
- выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры.

Праграма складаецца з аглядавых і манаграфічных тэм. У аглядавых даецца агульная характарыстыка пэўнага перыяду, вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі ў творчасці пісьменнікаў, раскрываецца ўплыў грамадска-палітычных падзей на літаратуру. Манаграфічна прапануецца вывучаць творчасць мастакоў слова, што заявілі пра сябе як яркія індывідуальнасці і вызначаюць мастацкі ўзровень сённяшняй літаратуры.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.* Згодна тыпавому вучэбнаму плану па спецыяльнасці 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура» вучэбная дысцыпліна «Сучасны літаратурны працэс» уваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі. Вучэбная дысцыпліна «Сучасны літаратурны працэс» звязана з вучэбнымі дысцыплінамі «Гісторыя беларускай літаратуры», «Сусветны літаратурны працэс» і абапіраецца на паняцці, атрыманыя падчас вывучэння вучэбных дысцыплін «Уводзіны ў літаратуразнаўства» і «Тэорыя літаратуры». Для вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Сучасны літаратурны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

працэс» неабходна таксама наяўнасць у навучэнцаў акадэмічных кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне «Літаратурная крытыка», фарміраванне якіх патрэбна забяспечыць у рамках кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сучасны літаратурны працэс» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных, прафесійных кампетэнцый.

*Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый*

Студэнт павінен:

АК-5. Быць здольным нараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

*Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый*

Студэнт павінен:

СЛК-3. Валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый.

СЛК-4. Валодаць навыкамі здароўязахавання.

*Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый*

Студэнт павінен быць здольны:

ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную работу навучэнцаў.

ПК-11. Развіваць вучэбныя магчымасці і здольнасці навучэнцаў на аснове сістэмнай педагагічнай дыягностыкі.

ПК-12. Развіваць навыкі самастойнай работы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і інш. сродкамі інфармацыі.

ПК-13. Арганізоўваць і праводзіць карэкцыйна-педагагічную дзейнасць з навучэнцамі.

ПК-14. Папярэджваць і пераадольваць непаспяховасць навучэнцаў.

ПК-15. Фармуляваць адукацыйныя і выхаваўчыя мэты.

ПК-16. Ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

ПК-18. Арганізоўваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.

ПК-19. Аналізаваць і ацэньваць педагагічныя з'явы і падзеі мінулага ў святле сучасных навуковых ведаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

- шляхі і галоўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай літаратуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- асаблівасці стылю і творчай манеры пісьменнікаў;
- агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў сучасных пісьменнікаў;
- праблематыку, ідэйны змест твораў, асаблівасці кампазіцыі, вобразна-выяўленчыя сродкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *умець*:

- бачыць логіку літаратурнага працэсу;
- аналізаваць літаратурны твор, раскрываючы спецыфіку яго зместу і формы;
- выяўляць падобнае і адметнае ў літаратурах розных народаў;
- упісаць літаратурны твор у сацыякультурны кантэкст эпохі і краіны;
- тлумачыць функцыі сімвалаў у мастацкіх тэкстах;
- бачыць адметнасці развіцця той ці іншай тэмы альбо матываў у розных літаратурах;
- працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *валодаць:*

- адпаведным тэрміналагічным і паняційным апаратам;
- сучаснай методыкай і метадалогіяй літаратуразнаўчых даследаванняў.

По кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія. Рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання: тлумачэнне, эмпірычная гутарка, аналіз літаратурна-крытычных тэкстаў, аналіз мастацкіх твораў, супастаўленне мастацкага твора і літаратурна-крытычнага водгуку на яго і інш.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Сучасны літаратурны працэс» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна (кіруемая самастойная работа студэнтаў), напісанне рэфератаў, падрыхтоўка дакладаў для выступлення на студэнцкіх навуковых канферэнцыях і інш.

*Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы бягучай атэстацыі.* Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сучасны літаратурны працэс» разлічана на 234 гадзіны. З іх 100 аўдыторныя гадзіны: 54 лекцыйных (з іх 4 КСР) і 46 практычных (з іх 4 КСР). Форма кантролю – залік (VII семестр), экзамен (VIII семестр). Размеркаванне раздзелаў і тэм па семестрах: VII семестр – раздзел 1 (тэмы 1.1 – 1.5), VIII семестр – раздзел 2 (тэмы 2.1 – 2.5).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На самастойную работу студэнтаў адведзена 98 гадзін: тэма 1.1 – 4 гадзіны, тэма 1.2 – 8 гадзін, тэма 1.3 – 4 гадзіны, тэма 1.4 – 10 гадзін, тэма 1.5 – 4 гадзіны, тэма 2.1 – 10 гадзін, тэма 2.2 – 14 гадзін, тэма 2.3 – 10 гадзін, тэма 2.4 – 16 гадзін, тэма 2.5 – 12 гадзін.

Раздзелы (тэмы), па якіх праводзяцца рэйтынгавыя кантрольныя работы: тэмы 1.1–1.5 – рэйтынгавая кантрольная работа № 1; тэмы 2.1–2.2 – рэйтынгавая кантрольная работа № 2; тэма 2.3– рэйтынгавая кантрольная работа № 3, тэмы 2.4–2.5 – рэйтынгавая кантрольная работа № 4.

Вучэбным планам на філалагічным факультэце для спецыяльнасці 1–02 02 03 01 «Беларуская мова і літаратура» (завочная форма атрымання адукацыі) на IV курсе ў VII семестры прадугледжана 6 гадзін лекцыйных заняткаў, у VIII семестры – 4 гадзіны практычных заняткаў, на V курсе ў IX семестры прадугледжана 8 гадзін лекцыйных заняткаў і 8 гадзін практычных заняткаў, 74 гадзіны адведзена на самастойную працу студэнтаў. Формы кантролю – залік (VIII семестр), экзамен (X семестр).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. СУЧАСНЫ СУСВЕТНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС

***Тэма 1.1. Сэнсавыя дамінанты сучаснай культуры і літаратуры. Постмадэрнізм***

«Цэнтр і перыферыя» ў культуры: маргінальнасць як фактар развіцця літаратуры. Шматлікія формы рэалізму ХХ стагоддзя і іх роля ў развіцці новай літаратуры. Пераасэнсаванне фігуры аўтара ў літаратурным працэсе. Месца і роля мастацкай літаратуры ў сучасным свеце. Масавая культура. Паэтыка масавай літаратуры: арганізацыя сюжэта, тыпу героя. Жанры масавай літаратуры. Белетрыстыка.

«Сітуацыя постмадэрну»: тэарэтычныя аспекты вывучэння сучаснай літаратуры (іронія, пародыя, самапародыя, «двайное кадзіраванне» тэксту, інтэртэкстуальнасць, «цытатнае мысленне»). Умберта Эка «Імя ружы».

***Тэма 1.2. Сучасная літаратура еўрапейскіх краін***

Агульная характарыстыка развіцця літаратуры еўрапейскіх краін канца ХХ – пачатку ХХІ стагоддзяў.

Асаблівасці сучаснай французскай літаратуры: асноўныя прадстаўнікі і тэмы. Вечныя тэмы ў творах Рамэна Гары, Хорхе Семпруна, Патрыка Мадзіана, Мішэля Уэльбека, Жана-Філіпа Тусэна, Фрэдэрыка Бегбедэра, Амелі Натомб, Мартэна Пажа, Жана-Крыстофа Гранжэ, Жан-Мары Гюстава Леклезіа і інш.

Літаратура Велікабрытаніі: асаблівасці развіцця на мяжы стагоддзяў. Творы Джона Фаўлза, Стывена Фрая, Джуліана Барнса, Джона Бойна, Джонатана Коў, Кадзуа Ісігуры, Гарольда Пінтэра, Шэймуса Хіні і інш.

Літаратура сучаснай Германіі: постмадэрнісцкія стратэгіі тэксту. Патрык Зюскінд, Юдзіт Куккарт, Грэта Мюлер, Арнольд Штадлер, Бернхард Шлінк, Вільгельм Генацына, Хельмут Краўсэр, Юлі Цэе, Гюнтэр Грас і інш.

Сучасная літаратура Італіі, Іспаніі і Партугаліі: аднаўленне прынцыпаў пісьма. Дарыа Фо, Каміла Хасэ Села, Жазэ Сарамага і інш.

Літаратура скандынаўскіх краін на сучасным этапе: асаблівасці творчага метаду пісьменнікаў ХХІ стагоддзя. Творы Тумаса Транстромера.

***Тэма 1.3. Літаратура славянскіх краін***

Росквіт рамана, размыканне яго жанравых межаў, змяненне апавядальных структур, пранікненне фальклорнай і міфалагічнай вобразнасці ў мастацкія творы. Масавая літаратура. Навуковая фантастыка і фэнтэзі. Літаратура на мяжы ХХ–ХХІ стагоддзяў. Творы Януша Вішнеўскага, Імрэ Кертэса, Віславы Шымборскай, Герты Мюлер і інш.

***Тэма 1.4. Літаратура краін амерыканскага кантыненту***

Спалучэнне традыцый навуковай фантастыкі і выпрацоўка жанру рамана-антыўтопіі ў амерыканскай літаратуры (Рэй Брэдберы, Курт Ванегут). Раманы-жахі Стывена Кінга. Літаратура на мяжы ХХ–ХХІ стагоддзяў. Творы Дэніэла Кіза, Чака Паланіка, Дэна Сіманса, Тоні Морысана, Джэрома Сэлінджэра, Харпер Лі, Джэка Керуака і інш. Жанр коміксу ў амерыканскай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спецыфіка лацінаамерыканскай прозы ў XXI стагоддзі. Перайманне еўрапейскіх традыцый. Зварот да нацыянальнай гісторыі і народнай творчасці. Спалучэнне рэальнага і міфалагічнага, фантастыкі і гратэску ў межах магічнага рэалізму. Габрыэль Гарсія Маркес, Жорж Амаду, Хасэ Картасар, Хасэ Луіс Борхес, Паула Каэлья, Лаура Эсківель і інш.

***Тэма 1.5. Літаратура краін Усходу і Азіі***

